# СУЧАСНАЯ П’ЕСА ДЛЯ МОЛАДЗІ: ТРАДЫЦЫЙНАЕ І НАВАТАРСКАЕ, АКСІЯЛАГІЧНАЕ НАПАЎНЕННЕ

**А. С. Кавалюк**

*УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”, Брэст, Рэспубліка Беларусь,* box@brsu.by

У артыкуле акцэнтуецца ўвага на традыцыйным і наватарскім у сучаснай драматургіі для падрастаючага пакалення, яе выхаваўчым патэнцыяле.

***Ключавыя словы:*** сучасная беларуская драматургія; п’еса; гістарычная тэматыка; каштоўнасныя прыярэтэты.

# СОВРЕМЕННАЯ ПЬЕСА ДЛЯ МОЛОДЕЖИ: ТРАДИЦИОННОЕ И НОВАТОРСКОЕ, АКСИОЛОГИЧЕСКОЕ НАПОЛНЕНИЕ

**Е. С. Ковалюк**

*УО “Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина”, Брест, Республика Беларусь,* box@brsu.by

В статье акцентируется внимание на традиционном и новаторском в современной драматургии для подрастающего поколения, ее воспитательном потенциале.

***Ключевыя слова:*** современная белорусская драматургия; пьеса; историческая тематика; ценностные приоритеты.

Пры выяўленні традыцый і наватарства беларускай дзіцячай драматургіі на сучасным этапе ў манаграфіі А. Трафімчыка [2] у поле зроку даследчыка трапілі наступныя творы для моладзі: меладрама Г. Марчука “Каханне маё нешчаслівае” (1998), рускамоўная п’еса А. Дзялендзіка “Восы” (2003), меладрама А. Дударава “Кім” (2000), камедыя З. Дудзюк “Люба ў шлюбе”, яе трагікамедыя “Бамбавозы” і драма “Падданыя кахання” (2003), камедыя Я. Конева “Старажытны перыяд, або Гісторыя і каханне” (2006).

У артыкуле “Берасцейская п’еса для дзяцей і моладзі ў кантэксце нацыянальнай літаратурнай традыцыі” А. Кавалюк асэнсаваны гістарычныя п’есы з кнігі Г. Марчука “Святло вышыні”: “Кракаўскі студэнт” (1985), “Лета 1532 года” (2016), “Святло вышыні” (2016), “Альгерд” (2016), з кнігі З. Дудзюк “Гістарычныя драмы”: “Скарына з Полацка”, “Нарадзіўся я ліцвінам”, “Мікола Гусоўскі”, “Падданыя кахання”, “Берасцейская мелодыя”, а таксама драматызаваны расповед А. Крэйдзіча

“Палескі Напалеон”. Творы аўтараў з Берасцейшчыны разглядаюцца ў кантэксце паказу беларускай літаратурай гістарычнага мінулага і выбітных асоб краю. П’есы З. Дудзюк “Скарына з Полацка” і Г. Марчука “Кракаўскі студэнт”, “Лета 1532 года”, “Святло вышыні”, прысвечаныя Ф. Скарыне, пастаўлены ў кантэкст беларускай драматургічнай скарыніяны, распачатай А. Петрашкевічам яшчэ ў 1970-я гады (“Напісанае застаецца” і “Прарок для Айчыны”).

Запатрабаваная на хвалі нацыянальнага адраджэння пачатку 1990-х гадоў як актыўны сродак далучэння моладзі да гісторыі роднага краю гэтая тэма застаецца прыярэтэтнай і сёння. У шэрагу п’ес створаны вобразы славутых гістарычных асоб, якія з’яўляюцца прыкладам патрыятызму і чалавечай годнасці. Пра полацкую Рагнеду пісалі ў сваіх драмах А. Петрашкевіч (“Гора і слава”, “Меч Рагвалода”), І. Чыгрынаў (“Звон – не малітва”), А. Дудараў (“Палачанка”). Вобразы такіх выдатных гістарычных асоб, як Еўфрасіння Полацкая і Барбара Радзівіл, раскрываюцца ў гістарычных драмах “Крыж Еўфрасінні Полацкай” І. Масляніцынай, “Чорная панна Нясвіжа” (1998) А. Дударава, “Барбара Радзівіл” (1992) Р. Баравіковай. Гістарычнае мінулае Беларусі і вобразы славутых беларусаў шырока прадстаўлены ў драматургічнай спадчыне А. Петрашкевіча: “Гора і слава” (“Русь Кіеўская”) (трагедыя Полацкага княства і хрышчэнне Русі), “Меч Рагвалода” (бітва на Нямізе і лёс Усяслава Чарадзея), “Крыж святой Еўфрасінні”, трагедыя “Крыжовы шлях на Грунвальд”, “Расплата за здраду” (мяцеж Міхайлы Глінскага і яго спроба далучэння ВКЛ да Масковіі), “Рупнасць дзяржаўцы” (дзейнасць Льва Сапегі), дылогія пра Ф. Скарыну “Напісанае застаецца” і “Прарок для Айчыны”, дылогія пра паўстанні Т. Касцюшкі і К. Каліноўскага “Развітанне з Радзімай” і “Рыцар Свабоды”, “Апошні зборны чын” (Слуцкае антысавецкае паўстанне 1920 года), трагедыя “Воля на крыжы” (лёс Я. Купалы). Арыгінальнасцю інтэрпрэтацыі вядомых фактаў і падзей беларускай гісторыі вызначаюцца п’есы І. Чыгрынава: часоў Рагнеды (“Звон – не малітва”), Крычаўскага паўстання XVIII ст. (“Следчая справа Вашчылы”), драматычных часоў сталіншчыны (“Чалавек з мядзвежым тварам”, “Ігракі”). Усім названым творам уласціва пазнавальнасць і выхаваўчы патэнцыял.

А. Трафімчык звярнуў увагу на “тэндэнцыю, якая акрэслілася на сучасным этапе ў школьнай праграме: маладой чытацкай аўдыторыі прапануюцца п’есы на гістарычную тэматыку, прадукаванне якіх апошнім часам стала асабліва актыўным, нібыта беларускія аўтары імкнуцца кампенсаваць недапрацоўкі савецкага перыяду і «нагнаць упушчанае»” [2].

Бачыцца мэтазгодным, каб сучасная драматургія ў школьнай праграме была прадстаўлена і творамі, больш блізкімі вучням сваёй тэматы-

кай і праблематыкай. Такой п’есай успрымаецца “Пазычанае шчасце” Ф. Палачаніна, надрукаваная ў “Антологии современной белорусской драматургии” (2016). Рускамоўная сучасная беларуская п’еса прадстаўлена ў ёй творамі “Тихий шорох уходящих шагов” Д. Багаслаўскага, “Лондон” М. Дасько, “Это всё она” А. Іванова, “Участковые, или Преодолеваемое противодействие” В. Каралёва, “Пане Коханку” А. Курэйчыка, “Дожить до премьеры” М. Рудкоўскага, “Лифт” Ю. Чарняўскай. З беларускамоўнай сучаснай п’есы ў зборнік увайшлі “Пясняр” В. Дранько-Майсюка, “Чорная панна Нясвіжа” А. Дударава, “Злачынства і пакаранне на берагах Свіслачы” Я. Конева, “Навагоднія прыгоды Марусі” Т. Красновай-Гусачэнка, “Цётухна Прастуда і Новы год” Н. Марчук і “Пазычанае шчасце” Ф. Палачаніна.

Апошняя ў пераліку – меладрама ў дзвюх частках, якая сваёй праблематыкай будзе цікава моладзі, бо асэнсоўвае важныя для яе ўзросту праблемы першага кахання, міжасабовых адносінаў, бацькоў і дзяцей, інш. У творы адносна невялікага аб’ёму аўтару ўдалося паказаць лёс вясковай дзяўчыны, якая будучы студэнткай зацяжарыла і, баючыся асуджэння ў вёсцы і бацькавай кары, ледзь не закончыла жыццё самагубствам. У цяжкі момант на дапамогу ёй прыйшла сяброўка дзяцінства, якая ўгаварыла свайго мужа выканаць ролю жаніха Алы на імправізаваным для бацькі і вяскоўцаў вяселлі. Сама Рая была ў гэтым спектаклі за сведку нявесты. З часу вяселля ніхто больш не бачыў мужа Алы: па прыдуманым сцэнараі яе Валера ўтапіўся. Гонар будучай настаўніцы Алы Пятроўны быў уратаваны. Яна нарадзіла і выгадавала дачку, якую ў гонар бацькі назвала Валерыяй. Дзяўчына вырасла, сустрэла хлопца, сабралася за яго замуж. Каб пазнаёміць са сваімі родзічамі, паказала яму сямейны альбом. Андрэй на вясельным фотаздымку сваёй будучай цешчы ўбачыў сваіх бацькоў: бацьку жаніхом поруч з Алай Пятроўнай, маці – яе дружкай. Малады чалавек учыняе допыт бацькам, расчаравана абвінавачвае іх у несумленнасці. Балюча хлопцу прызнаць, што яго каханая з’яўляецца яму сястрой. Яшчэ страшнейшы прысуд выносіць бацькам Андрэя дзед Валерыі, які ўсе гэтыя гады маліўся за ўпакой душы зяця-нябожчыка, а ён аказаўся жывым. Драматургу ўдалося стварыць інтрыгу, дынамічна пабудаваць дзеянне.

П’еса мае высокую ступень умоўнасці, якая праяўляецца праз вобразы Маці-Часу і Ненароджанага дзіцяці. Ф. Палачанін пераконвае маладых, што паміж маці і дзіцем, нават ненароджаным, існуе цесная сувязь: “Ненароджанае дзіця. *Ты, напэўна, і не ўяўляеш, якая цесная сувязь існуе ў мяне з гэтым светам?! <...> Праз твае думкі, настрой, справы. <...> Мне радасна, калі ў цябе вясёлы настрой. <...> Мне вельмі балюча, калі ты плачаш. <...> Прыемна слухаць спакойны стук твайго*

*сэрца. <...> Я люблю слухаць песні, музыку. <...> Мне так хочацца нарадзіцца на гэты дзівосны свет! Я моцна хачу парадаваць цябе. І не толькі цябе… Няўжо ты не хочаш, каб я называла цябе мамай?!*” [1, с. 492]

Душа памерлай Маці аберагае дачушку праз усё яе жыццё. Разам з Ненароджаным дзіцем Маці-Час ратуе дзяўчыну ад самагубства: “Маці-Час. *Жыццё – Дар Божы. І ім трэба даражыць. Жыццё дадзена на добрыя справы. Яго трэба пражыць дастойна, каб не было сорамна ні табе, ні тваім родным. А ты хацела загубіць не толькі сябе, але яшчэ і Ненароджанае дзіця. Гэта ж страшны грэх, ганьба не толькі на сям'ю, але і на ўвесь наш род*” [1, с. 493]. У творы выразна прадстаўлена хрысціянская канцэпцыя чалавека і свету. Аўтар паказвае шлях уратавання душы праз малітву і пакаянне. Бацькі Алы – глыбока веруючыя людзі. Але пры гэтым, для бацькі вельмі важная яго рэпутацыя ў вёсцы. А маці здолела аргументаваць па-хрысціянску кошт чалавечага жыцця як Божага дару.

П'еса “Пазычанае шчасце” Ф. Палачаніна асэнсоўвае вельмі важныя праблемы чалавечага быцця, вечныя ва ўсе часы, накіравана на фарміраванне каштоўнасных прыярэтэтаў у моладзі.

## Библиографический список


1. Антология современной белорусской драматургии / Сост. Т. Ф. Рослик. – Минск : Беларус. энцыкл., 2016. – 654 с.
2. *Трафімчык, А*. Беларуская дзіцячая драматургія / А. Трафімчык. – Мінск, 2012. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.gants-region.info/_ld/1/184_25716-1.pdf – Дата доступу: 10.12.2023.